# Калейдаскоп

лістапад 2023

**Школьная газета №3 (53)**

*"Наша мова для нас святая, бо яна нам ад Бога даная"*

*Ф. Багушэвіч*




**3 лістапада 1882 года нарадзіўся Якуб Колас**



# Паэты і пісьменнікі пра мову

**Калейдаскоп**
**лістапад 2023**

**Ніякае багацце людзей не бывае даражэйшым за іх родную мову. (Якуб Колас)**

**Мова – гэта вялікі народны скарб. Яе нельга не паважаць, як нельга не паважаць родны народ. (Іван Мележ)**

**Толькі праз родную мову чалавек можа стаць беларусам, бо ў ёй хімія і фізіка, гісторыя і батаніка, эканоміка і культура таго, што называецца нацыяй, народам. (Янка Сіпакоў)**

**Родная мова, быццам цэмент, звязвае людзей. Яна дае ім найлепшы спосаб разумець адзін аднаго, адной думкай жыць, адной долі шукаць. (Цётка)**

**Любіце і шануйце, як святыню, роднае слова, з якім вас літасцівы Бог на свет пусціў. (Францішак Скарына)**

**Кожны народ мае хаця б адзін геніяльны творы, і гэты твор – мова. (Алесь Разанаў)**

**Незвычайнае хараство і зладжанасць чуецца нам у гучанні роднага слова. (Анатоль Крывіцкі)**

**Хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў. (Уладзімір Караткевіч)**

**Там, дзе не шануюць роднай мовы, мялеюць рэкі, нішчацца дубровы, народ той мёртвы, а той край нямы. (Генадзь Бураўкін)**



## ЛІСТАПАД

Апошні месяц восені, адзінаццаты — года меў старабеларускую назву грудзень (ад слова “груды” ў значэнні “замёрзлая зямля”). Сучаснае беларускае найменне лістапад тлумачыцца проста: канец ападання лісця з дрэў (таксама ва ўкраінцаў листопад, палякаў і чэхаў listopad).

**Рускі ноябрь**, балгарскі ноември, нямецкі den november, вянгерскі і славацкі novembra, утрымліваюць агульную лацінскую аснову novem (дзевяць). Французскія рэвалюцыянеры называлі месяц брумерам, што азначала “туманны”.

У пачатку лістапада адлятаюць апошнія чароды качак, дрэвы стаяць ужо амаль без лісця, тэмпература паветра ніжэй нуля, з’яўляюцца туманы. Імжыстыя дажджы ў другой палове месяца змяняюцца на мокры снег.

Вёска на нейкі час вызваляецца ад сельскагаспадарчых работ. Дары асенняга поля і лесу ўжо добра ўладкаваны ў склепах і кладоўках. Самы час успомніць тых апекуноў, якія спрыялі земляробу, і, у першую чаргу, продкаў, “дзядоў”. Багаты стол запрашае сватоў парадніц сваіх дзяцей. А вечары, што сталі даўжэйшымі, нагадваюць жанчынам аб кудзелях і піліпаўскіх вячорках.



# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**лістапад 2023**

**У лістападзе гола ў садзе.**
**Лістапад зіме сцежку пракладае.**
**Лістапад снегу навее – хлеба прыбудзе, а вада разальецца – сена набярэцца.**

А**пошні месяц восені,** адзінаццаты – года меў старабеларускую назву **груздень** (ад слова «груды» ў значэнні «замёрзлая зямля»). Сучаснае беларускае найменне лістапад тлумачыцца проста: канец ападання лісця з дрэў (таксама ва ўкраінцаў листопад, палякаў і чэхаў listopad). Рускі ноябрь, нямецкі, вянгерскі, славацкі nowember утрымліваюць агульную лацінскую аснову novem (дзевяць). У старажытнарымскім календары november – дзевяты.

У пачатку лістапада адлятаюць апошнія чароды качак, дрэвы стаяць ужо амаль без лісця, з`яўляюцца туманы. Вёска на нейкі час вызваляецца ад сельскагаспадарчых работ. Дары асенняга поля і лесу ўжо добра ўладкаваны ў склепах і кладоўках. Самы час успомніць тых апекуноў, якія спрыялі земляробу, і, у першую чаргу, продкаў — «дзядоў». Багаты стол запрашае сватоў парадніць сваіх дзяцей. А вечары, што сталі даўжэйшымі, нагадваюць жанчынам аб кудзелі і пілiпаўскіх вячорках.

Як звычайна, назіранні селяніна накіраваны на стан прыроды, паводзіны жывёлы, птушак, па якіх ён вызначае будучае надвор`е. Неба ўсю ноч чыстае, але вакол месяца з`явіліся вялікія кругі – будзе мароз; калі ж кругі гэтыя злёгку пачырванеюць – магчымы нават снегапад з ветрам. Калі дым з коміна падымаецца вертыкальна ўверх, няхай сабе і ў непагадзь, хутка надвор`е наладзіцца.

**1 лістапада.** Іван, Клеапатра. А ў каталіцкім календары — дзень Усіх Святых, калі адбываецца агульнае памінанне нябожчыкау. Народная творчасць, абыгрываючы назву гэтай урачыстасці, паведамляе пра змены надвор’я: «Па Усіх Святых — холад для ўсіх».

**2 лістапада.** Задушны дзень. Працяг памінальных дзён у католікаў.

**3 лістапада.** У праваслаўных — Памінальная, Радзіцельская субота.

**4 лістапада.** Казанская. «Хто на Казанскую жаніхаецца, той не пакаецца». У праваслаўным царкоўным календары – святкаванне Казанскага абраза Божай Маці. Захаваліся цікавыя народныя назіранні: “Да Казанскай – не зіма, а пасля – не восень; зранку – дождж, звечара – снег”; “На Казанскую дождж пойдзе – зіму прывядзе”; «Што Казанская пакажа, тое й зіма скажа».

**8 лістапада.** Дзень Дзмітрыя Салунскага.

# Народныя традыцыі

**Калейдаскоп**
**лістапад 2023**

**10 лістапада**. Параскева, Параскімка, Параскі Асенняя. Дзень забароны прадзення і ткання; заступніца жанчын і сям`і, апякунка жаночага рукадзелля. Царква да гэтага дня прыстасавала сяткаванне святой Параскевы Пятніцы – велікапакутніцы, якая жыла ў II стагоддзі ў Іконіі.

12 лістапада. Дзень Зіновія. Сінічкін дзень. Першае масавае з'яўленне сініц каля дамоў — прыкмета надыходзячых вялікіх халадоў.

**14 лістапада**. Кузьма-Дзям`ян (Кузьмінкі). Гэты дзень лічыўся прысвяткам кавалёў. А яшчэ дзень Кузьмы-Дзям'яна асабліва шанаваўся дзяўчатамі, бо гэтыя святыя спрыялі вяселлям.

**21 лістапада**. Міхайлаў дзень. Унукі ў гэты дзень наведвалі сваіх бабуль. Са святам звязана пацяпленне, так званыя Міхайлавы адлігі.

**22 лістапада.** Матроны зімовыя. З гэтага дня зіма ўстае на ногі, налятаюць маразы

**26 лістапада.** Іаан Златавуст. На Златавуста ўсё поле пуста.

**27 лістапада.** Святога Юстыніяна беларусы лічылі збавіцелем ад бясплоднасці. На абразах ён намаляваны з дзіцем на руках у малітве перад іконаю Божай Маці. Бяздзетныя ці тыя, у каго паміралі дзеці, абавязкова мелі абраз святога Юстыніяна ў сваім доме.

**28 лістапада**. Піліпаўка (Калядны, Піліпаўскі пост). Пачынаецца апошні ў годзе пост — Калядны, або Піліпаўскі (Піліпаўка), які працягваецца да самых Каляд (да 7 студзеня).

**29 лістапада** — Мацей. Восень не саступае зіме, і гэта асаблівасць стану прыроды перададзена ў прыкмеце: «На Мацея дарога пацея».



# Літаратурная старонка



**Паглядзі на жаўталісты сад**

**Паглядзі на жаўталісты сад.
Вунь ідзе між яблынь лістапад
І з вялізнага лазовага каша
Прадае падсмажаныя пернікі зямлі
За цану наспелай медзі ліп,
А лісты шуршаць, шуршаць, шуршаць.
Нехта пальцамі руплівых добрых рук
Ледзь крануўся сеткі павуцінных струн.
Пэўна, хоча пад суладны ціхі шум
Прывітаць, уславіць восені прыход,
Скінуць з плеч цяжар мінулых год
І напоўніць новай радасцю душу.
Восень, восень!
Тыя песні, перазвоненыя ўсе,
Адгулі бясследна ў пустацветавай красе,
Што спяваў табе калісь паэт,
Сумаваў,
што згас пурпур параненых вяргінь, –
У жыццё прыйшоў другі
Здзейсніць свайго сэрца запавет.
Паглядзі на жаўталісты сад
Вунь ідзе між яблынь лістапад.
Яснай песняй поўніцца душа, –
Мабыць, ведае, аб чым лісты шуршаць.**

**Васіль Вітка**



# Папулярызацыя беларускай мовы



### Урок беларускай літаратуры

**16 лістапада ў 2 «Г» класе** прайшоў незвычайны ўрок беларускай літаратуры. На занятку дзеці пазнаёміліся з біяграфіямі розных беларускіх аўтараў, прачыталі некаторыя творы, даведаліся цікавыя факты з жыцця пісьменнікаў. Дадзеная тэма спрыяла выхаванню пачуцця патрыятызму, любові да роднага слова, дала магчымасць вучням выказвацца і папаўняць свой слоўнікавы запас.



# Папулярызацыя беларускай мовы

**Калейдаскоп**
**лістапад 2023**

---

**«Куляшоўскія чытанні»**

З мэтай папулярызацыі беларускай мовы і з нагоды 110- годдзя з дня нараджэння А.Куляшова ў ДУДА «Эверэст» прайшоў конкурс «Куляшоўскія чытанні», у якім бралі ўдзел вучань 7 «Г» класа нашай школы Партненка Мацвей і вучань 9 «Б»класа Манёнак Мацвей. Юнакі прачыталі на памяць любімыя вершы паэта-земляка і атрымалі асалоду ад праслухоўвання іншых твораў пісьменніка ў выкананні аматараў творчасці А.Куляшова. Удзел у такіх мерапрыемствах спрыяе пашырэнню літаратурных ведаў вучняў і развіццю іх чытацкай граматнасці.

**Настаунік беларускай мовы і літаратуры Пышнюк А.А.**






## 1 лістапада 90 год з дня нараджэння Вячаслава Адамчыка



**Вячаслаў Адамчык нарадзіўся 1 лістапада 1933 года** ў вёсцы Варакомшчына, Навагрудскі павет, Навагрудскае ваяводства, Польша (цяпер Дзятлаўскі раён Гродненскай вобласці) у сялянскай сям’і. Беларускі празаік, драматург, кінасцэнарыст.

Скончыў сямігодку (1949), працаваў грузчыкам на станцыі Наваельня, адначасова вучыўся ў вячэрняй школе. У 1952—1957 займаўся на аддзяленні журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ. Працаваў у газетах «Знамя юности» (1957—1958), «За вяртанне на Радзіму» (1958—1960), рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР (1960—1962), рэдактарам аддзела публіцыстыкі часопіса «Полымя» (1962—1963). Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы пры СП СССР у Маскве (1965).Працаваў літсупрацоўнікам часопіса «Нёман» (1965—1967), загадчыкам рэдакцыі часопіса «Полымя» (1967—1969), рэдактарам аддзела прозы, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць» (1969—1977), галоўным рэдактарам сцэнарнай майстэрні пры кінастудыі «Беларусьфільм» (1977—1980), намеснікам галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1980—1982). З 1982 года — галоўны рэдактар часопіса «Бярозка». Прымаў удзел у рабоце XXXVIII сесіі Генеральнай асамблеі ААН (1983). Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1960 года.

Дэбютаваў вершамі ў 1952 годзе. Першае апавяданне апублікавана ў 1957 годзе. Аўтар зборнікаў прозы «Свой чалавек» (1958), «Млечны шлях» (1960), «Міг бліскавіцы» (1965), «Дзікі голуб» (1972), «Дзень ранняй восені» (1974), «Раяль з адламаным вечкам» (1990) і раманаў «Чужая бацькаўшчына» (1978, паводле рамана зняты аднайменны мастацкі фільм (1982) і пастаўлены тэлеспектакль (1983)), «Год нулявы» (1983), «І скажа той, хто народзіцца…» (1987), «Голас крыві брата твайго» (1990).

Напісаў сцэнарыі да дакументальных фільмаў «Іван Мележ» (зняты ў 1977), «Валянцін Таўлай» (зняты ў 1978), «Дзядзька Якуб» (зняты ў 1981), п’есу «Раіса Грамычына» (1989). Пераклаў кнігу балгарскіх народных казак «Незвычайны асілак» (1961), паасобныя творы М. Прышвіна, Ю. Казакова, С. Залыгіна і інш. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1980) за раман «Чужая бацькаўшчына», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1988) за раманы «Чужая бацькаўшчына», «Год нулявы», «І скажа той, хто народзіцца…».

## 20 лістапада 75 год з дня нараджэння Яўгеніі Янішчыц



**Яўгенія Іосіфаўна Янішчыц нарадзілася 20 лістапада 1948 года** ў вёсцы Рудка Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў простай сялянскай сям'і .

Маці Жэні — Марыя Андрэеўна, бацька — Іосіф Сцяпанавіч працавалі ў калгасе.

У 1955 годзе Жэня пайшла ў першы клас Рудкаўскай пачатковай школы. У чацвёртым класе Жэня напісала свой першы верш і прысвяціла яго маці. Пасля заканчэння Рудкаўскай пачатковай школы Жэня вучылася ў Мерчыцкай васьмігодцы. У снежні 1962 года ў раённай газеце «Палеская праўда» з'явіліся першыя друкаваныя творы Яўгеніі.



1 верасня 1963 Жэня прыйшла ў 9 клас Парэцкай сярэдняй школы. У гэтым жа годзе яна напісала свой першы рукапісны зборнік вершаў «Першыя россыпы». Яе вершы друкуюцца ў раённай газеце і рэспубліканскіх выданнях. Жэня становіцца гонарам школы і сваёй “малой радзімы”.

У Мінску пачынаецца бурлівае жыццё дзяўчыны з Палесся. У 1966 Яўгенія закончыла 11 класаў Парэцкай сярэдняй школы і ў жніўні паступіла на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры БДУ. З 21 кастрычніка 1969 Жэня пачала друкаваць свае вершы амаль што ў кожнай газеце «Беларускі ўніверсітэт».



У 1969 годзе Жэня прымала ўдзел ва Усесаюзнай нарадзе маладых паэтаў і пісьменнікаў у Маскве. У 1970 годзе выйшаў першы зборнік «Снежныя грамніцы».

У 1971 годзе Яўгенію Янішчыц прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. У гэтым годзе яна закончыла ўніверсітэт і працуе загадчыцай бібліятэкі ЦКЛКСМБ. Выходзіць замуж за беларускага паэта Сяргея Панізніка, тады вайскоўца, і маладыя едуць у Чэхаславакію. Сяргей працуе ваенным карэспандэнтам, а Жэня ўладкоўваецца на працу ў бібліятэку адной з воінскіх частак. Праз год Яўгенія вяртаецца на радзіму. 14 лістапада 1972 года яна стала маці – нарадзіла сына Андрэя. З 1974 па 1976 гады знаходзіцца на творчай працы.

У 1974 годзе выходзіць кніга «Дзень вечаровы», за якую атрымала прэмію Ленінскага камсамола Беларусі ў 1978 годзе.

# Юбілейныя даты



## 20 лістапада 75 год з дня нараджэння Яўгеніі Янішчыц



З 1976 літкансультант у рэдакцыі «Сельскай газеты». З 1983 года – загадчык аддзела паэзіі часопіса «Маладосць».

Асабістае жыццё складвалася няўдала. Пасля разводу жыла адна, выхоўвала сына, сумленна несла грамадскія нагрузкі. Творчая кар’ера, не ў прыклад асабістага жыцця, складвалася паспяхова. Я. Янішчыц – дэпутат райсавета Савецкага раёна г. Мінска, член праўлення і прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі.

У 1981 прымала ўдзел у рабоце Генеральнай Асамблеі ААН.

У 1978 годзе выходзіць кніга «Ясельда, у 1980 – «На беразе пляча», 1983 – «Пара любові і жалю», за якую атрымала Дзяржаўную прэмію БССР імя Я. Купалы ў 1986.




Свае карэспандэнцыі падпісвала псеўданімамі Ж. Заметкіна, Е. Іосіфава, Ясяльдзянка. Вершы яе змяшчаліся ў часопісах «Маладосць», «Беларусь», «Неман», «Молодая гвардия», «Дружба народов», «Огонек», газетах «Литературная Россия», «Литературная газета», альманаху «Поэзия», штогодніку «Дзень паэзіі», калектыўных зборніках БДУ і Гамбургскага педінстытута, у анталогіі маладой беларускай паэзіі на Украіне. 1970 год — дыпламант беларускага фестывалю творчасці маладых . Аўтар зборнікаў паэзіі «Ясельда», «Каліна зімы». Выдала кнігу выбранай лірыкі «У шуме жытняга святла».

Пісала апавяданні, выступала ў друку з артыкуламі, рэцэнзіямі. Некаторыя творы паэтэсы (у тым ліку незакончаная паэма «Галалёд») былі надрукаваны пасмяротна (Полымя. 1993. № 5).



Вершы Я. Янішчыц перакладзены на англійскую, балгарскую, іспанскую, нямецкую, польскую, рускую, украінскую мовы. На словы паэтэсы кампазітары Р. Давыдаў, Ю. Семяняка, М. Юрко і інш. напісалі песні.

У апошнія гады жыла адна, выхоўвала сына. Друкавалася ў вядучых літаратурных выданнях не толькі сваёй краіны, а і за яе межамі.

25 лістапада 1988 года трагічна загінула і пахавана на Усходніх могілках у Мінску.

# Літаратурная старонка

Калейдаскоп
лістапад 2023



## Мова

Чую тваю жаўруковую музыку
Ў скошаных травах мурожных.
Мова! Як сонца маё
беларускае,
Ты свецішся словам кожным.
Цябе і заворвалі, і закопвалі,
І ўсё ж нашы продкі праз гора
Данеслі да нас цябе,
родную, цёплую,
Жывую і непаўторную.
І калі ты мяне толькі паклікаеш,
Памру за цябе без енку.
Нашу я любоў да цябе
вялікую
У сэрцы сваім маленькім.

**Яўгенія Янішчыц**

# Цікава ведаць

**Калейдаскоп**
**лістапад 2023**







**Рэдкалегія: Кудраўцаў А.(9б),**
**Крупянкова А.(9б),**
**Фруцкая А.(9б),**
**Шаўцоў Д.(9б)**
**Рэдактар Юрчанка С.А.**